Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь

УА "Беларускі дзяржаўны універсітэт культуры і мастацтваў"

**ЗАЦВЯРДЖАЮ**
Першы прарэктар
УА "Беларускі дзяржаўны
ўніверсітэт культуры і мастацтваў"
_________________ Ю.П.Бондар
"___" _______________2012 г.
Рэгістрацыйны № -ВД ___ / вуч.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# МАСТАЦКА-ДЭКАРАТЫЎНАЕ ВЫРАШЭННЕ СВЯТА

**Вучэбная праграма**

**для вышэйшых навучальных устаноў**

**па спецыяльнасці 1-17 01 05 «рэжысура свят»**

**напрамак 1-17 01 05-01 «рэжысура свят (народныя)»**

Мінск 2012

**СКЛАДАЛЬНІК:**

Г.А. Барвенава, кандыдат мастацтвазнаўства, дацэнт, дацэнт кафедры рэжысуры абрадаў і свят Установы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»

**РЭЦЭНЗЕНТЫ:**

Ю.Д. Персіцкая, загадчык кафедры эстрады установы адукацыі «Беларускі дзяржаўны універсітэт культуры і мастацтваў», кандыдат мастацтвазнаўства, дацэнт;

П.А. Гуд, кандыдат гістарычных навук, прафесар, загадчык кафедры рэжысуры абрадаў і свят установы адукацыі "Беларускі дзяржаўны універсітэт культуры і мастацтваў"

**РЭКАМЕНДАВАНА:**

Кафедрай рэжысуры абрадаў і свят установы адукацыі «Беларускі дзяржаўны універсітэт культуры і мастацтваў»

(пратакол № 1 ад 28.08.2012 г.)

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Тлумачальная запіска

«Мастацка-дэкаратыўнае вырашэнне свята» — адна з спецыяльных дысцыплін у курсе падрыхтоўкі высокакваліфікаваных спецыялістаў у галіне святочнай культуры. Мэтанакіраванае і асэнсаванае выкарыстанне архітэктурнага і прыроднага ландшафту, гістарычнай сімволікі, адметнасцяў матэрыяльнай культуры Беларусі, законаў кампазіцыі, колеру, святла, выразных сродкаў сучаснай сцэнаграфіі дапамагае стварыць паўнавартаснае сцэнічнае дзеянне. Аб’яднаць разрозненае, стварыць цэласнае выяўленча-пластычны вобраз, які існуе ў сцэнічным часе і прасторы – мэта сцэнаграфіі.

*Мэта* курса «Мастацка-дэкаратыўнае вырашэнне свята» – на аснове ведаў па матэрыяльнай культуры Беларусі, тэорыі сцэнаграфіі навучыць будаваць канцэптуальныя палажэнні сцэнаграфічнага вырашэння рэжысёрскіх прац, высокапрафесійна ўвасабляць яе здабыткі ў сучаснай святочнай культуры.

*Задачы* курса:

- засвоіць прынцыпы арганізацыі прасторы свята мастацка-дэкаратыўнымі сродкамі;
- авалодаць асноўнымі мастацкімі і практычнымі пытаннямі пастановачнага комплексу свята;
- высокапрафесійна ўвасабляць здабыткі матэрыяльнай культуры Беларусі ў сучаснай святочнай культуры.

Курс разлічаны на вывучэнне шматпланавага матэрыялу. Асноўныя формы заняткаў - лекцыі, практычныя, індывідуальныя заняткі і самастойная работа. Падчас заняткаў разглядаюцца стварэнне сцэнаграфічнымі сродкамі неабходнага візуальнага асяроддзя, якое адлюстроўвае характар, “дух” задумы свята; разглядаюцца асноўныя сцэнаграфічныя прыёмы, звяртаецца увага на рэгіянальныя адметнасці традыцыйнай культуры і іх месца ў сцэнаграфіі народнага свята. Прысвячаецца ўвага методыцы работы над

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

стварэннем мастацкага афармлення тэматычнага, народнага свята, свята для пэўнай узроставай групы гледачоў.

Прафесійныя пытанні як кампазіцыя і каларыстыка свята, прыёмы і метады працы над кампазіцыяй свята, сімволіка свята патрабуюць самастойнага падбора студэнтам ілюстрацыйнага матэрыяла. На занятках разглядаюцца тэмы па сцэнаграфіі свята: асяроддзе свята, наладжванне сцэны і закуліснай прасторы, асноўныя часткі сцэны-кодаба, тэхнічнае аснашчэнне сцэны. Асобныя тэмы прысвечаны мастацка-дэкаратыўнаму вырашэнню свята на адкрытай прасторы і ў закрытым памяшканні, жанравым асаблівасцям свята.

У выніку вывучэння дысцыпліны студэнт павінен

**ведаць:**

- методыку работы над стварэннем мастацка-дэкаратыўнага вырашэння свята;
- адметнасці традыцыйнай культуры Беларусі і магчымасці іх выкарыстання ў сучасным свяце;
- метады і прыёмы кампазіцыйнай арганізацыі сцэнічнай прасторы ў залежнасці ад віда і жанра свята;
- метады і прыёмы кампазіцыйнай арганізацыі сцэнічнай прасторы ў залежнасці ад відаў і жанра відовішчных мастацтваў;
- методыку выкладання мастацка-дэкаратыўнага вырашэння свята;

**умець:**

- на аснове ведаў па матэрыяльнай культуры Беларусі ўмець будаваць канцэптуальныя палажэнні аўтарскіх рэжысерскіх прац;
- высокапрафесійна ўвасабляць задумы мастацка-дэкаратыўнага вырашэння свята на практыцы;
- выкарыстоўваць веды па гісторыі і культуры рэгіона ў мастацка-дэкаратыўным вырашэнні свята;
- валодаць практычнымі ўменнямі і навыкамі кампазіцыі, каларыстыкі, выстайвання фігур на сцэне і г.д.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

- ствараць прадметныя, штучныя і рухомыя сродкі візуальнага асяроддзя свята.
- ствараць знешняе аблічча персанажа.

Курс прадугледжвае як тэарэтычную, так і практычную падрыхтоўку студэнтаў. Пры гэтым трэба адзначыць, што курс разлічаны на студэнтаў, якія не маюць папярэдняй спецыялізаванай мастацкай падрыхтоўкі. Практычная частка курса прадугледжвае, па-першае, знаёмства з методыкай збору факталагічнага і ілюстрацыйнага матэрыялу па матэрыяльнай культуры Беларусі, авалодванне ўменнямі яго аналізу і магчымасці выкарыстання ў сцэнаграфіі свят. Па-другое, практычныя заняткі развіваюць у студэнтаў вобразна-кампазіцыйнае мысленне, дапамагаюць авалодаць методыкай паслядоўнай працы над сцэнаграфічным увасабленнем свята. Па-трэцяе, навучыцца выкарыстоўваць выяўленчыя сродкі ў рэалізацыі сваіх кампазіцыйна-пастановачных задум, граматна афармляць аўтарскія распрацоўкі.

Для плённага засваення студэнтамі матэрыялу праграмы падчас лекцыйных і практычных заняткаў аналізуецца тэматычная кніжная і veb-інфармацыя, шырока выкарыстоўваецца ілюстрацыйны матэрыял, асабліва па тэмах прысвечаных матэрыяльнай культуры, кампазіцыі, каларыстыцы, рэкламна-інфармацыйнаму матэрыялу. Таксама плануюцца наведванне і аналіз музейных экспазіцый, святочных і тэатральных пастановак, тэатральных і іншых сцэнічных пляцовак.

Праграма разлічана на 736 гадзін, у тым ліку: 358 аўдыторных гадзін. Прыкладнае размеркаванне аўдыторныга часу па відах заняткаў: лекцыі - 50 гадзін, практычныя заняткі - 262 гадзіны, індывідуальныя заняткі - 46 гадзін. Засваенне студэнтамі матэрыялу правяраецца на заліках і экзаменах.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ПРЫКЛАДНЫ ТЭМАТЫЧНЫ ПЛАН

| № | Тэма | Аўды-торныя гадзіны | Лекцыі | Практычныя заняткі | Індывідуальныя заняткі |
|---|---|---|---|---|---|
| | **Уводзіны**<br>Прадмет, мэта і задачы курса, яго значнасць і месца ў сістэме навучання рэжысёраў свята | **2** | **2** | | |
| | **Раздзел I. Матэрыяльная культура Беларусі ў кантэксце сучаснага свята** | | | | |
| 1 | Сімволіка. Месца і выкарыстанне сімволікі ў вобразным вырашэнні свята і яго мастацка-дэкаратыўным афармленні | **14** | **4** | **8** | **2** |
| 2 | Матэрыяльная культура Беларусі ў кантэксце сучаснага свята | **34** | **4** | **28** | **2** |
| 3 | Беларускі гістарычны касцюм, зброя і матэрыяльная культура магнатэрыі, шляхты і гараджан. Беларускі народны касцюм | **20** | **6** | **14** | |
| 4 | Месца касцюма, бутафорыі ў свяце | **10** | **2** | **6** | **2** |
| | **Раздзел II. Сцэнаграфія свята** | | | | |
| 5 | Сцэнаграфія сучаснай святочнай культуры Беларусі | **26** | **2** | **20** | **4** |
| 6 | Асновы кампазіцыі. Каларыстыка | **36** | **4** | **26** | **6** |
| 7 | Сцэнаграфія свята на адкрытай прасторы | **36** | **6** | **24** | **6** |
| 8 | Сцэнаграфія свята ў закрытым памяшканні | **48** | **6** | **40** | **2** |
| 9 | Жанравыя асаблівасці сцэнаграфіі свята | **34** | **4** | **26** | **4** |
| | **Раздзел III. Работа мастака-пастаноўшчыка над комплекснай сцэнаграфіяй свята** | | | | |
| 10 | Творчая група сцэнаграфіі свята і галоўныя прынцыпы яе работы | **10** | **2** | **6** | **2** |
| 11 | Складанне праекта комплекснай сцэнаграфіі свята | **10** | **2** | **4** | **4** |
| 12 | Рэкламна-інфармацыйны матэрыял свята | **10** | **2** | **6** | **2** |
| 13 | Крытэрыі ацэнкі мастацкіх вартасцей эскізаў і выкананых работ | **26** | **2** | **22** | **2** |
| 14 | Работа над сцэнаграфіяй дыпломнай пастаноўкі | **42** | **2** | **32** | **8** |
| | **Усяго** | **358** | **50** | **262** | **46** |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## ЗМЕСТ ДЫСЦЫПЛІНЫ

### Уводзіны

**Прадмет, мэта і задачы курса, яго значнасць і месца ў сістэме навучання рэжысёраў свята.**

Сценография и ее место в изобразительном искусстве. История и основные этапы развития сценографии. Перспективы развития и проблемы совершенствования современной сценографии. Методика работы над сочинением художественного оформления зрелища, реализация этого замысла в материале. Выразительные средства современной сценографии.

*Сцэнаграфія свята, яе стваральнікі.* Сцэнарый-рэжысёр-мастак. Месца, галоўная мэта і задачы рэжысёра і мастака-пастаноўшчыка ў візуальным вобразе свята. Творчая група. Стварэнне мастацка-дэкаратыўнымі сродкамі неабходнага візуальнага асяроддзя, якое адэкватна адлюстроўвае характар, "дух" задумы сцэнарыста і рэжысёра-пастаноўшчыка свята, тэму, мэту, ідэю святочнай дзеі.

*Сцэнаграфія.* Сцэнаграфія як матэрыяльна ўвасоблены элемент зрокавага вобраза свята, якая ўключае ўсё, што знаходзіцца вакол акцёра, ў яго руках і на ім. Тры асноўныя функцыі сцэнаграфіі: гульнёвая, дэкаратыўная, персанажная.

*Паняцце "асяроддзе". Кампаненты візуальнага асяроддзя свята.* Натуральнае прадметнае асяроддзе: архітэктура, прырордны ланшафт, інтэр'ер і інш. Штучнае прадметнае асяроддзе: стацыянарныя малыя архітэктурныя формы - сцэнічныя пляцоўкі, аказіяльная архітэктура (павільёны, кіёскі і інш.), афармленне фасадаў будынкаў, стацыянарныя ўстаноўкі, гульнёвыя атракцыёны, выставы аднаго дня і г.д. Рухомае асяроддзе: карнавальныя і іншыя шэсці; дэкараваныя рухомыя установкі (машыны, паветраныя шары, верталёты і г.д.); светлавое і гукавое афармленне (пражэктары, салюты, феерверкі). Сцэнічная і пазасцэнічная бутафорыя (касцюмы, прадметы дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва; прызы, рэкламна-інфармацыйная прадукцыя і інш.).

*Методыка збору матэрыялу* для стварэння адметнага шматварыянтнага вобразнага мастацка-дэкаратыўнага вырашэння свята.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Раздзел І. Матэрыяльная культура Беларусі ў кантэксце сучаснага свята

### Тэма 1. Сімволіка. Месца і выкарыстанне сімволікі ў вобразным вырашэнні свята і яго мастацка-дэкаратыўным аздабленні.

*Вызначэнне паняццяў "сімвал", "сімволіка".* Месца сімволікі ў вобразным мастацка-дэкаратыўным вырашэнні свята. Паняцце дзяржаўная, нацыянальная, народная сімволіка. Паняцце "геральдыка". Асноўныя правілы геральдыкі. Паняцце "герб". Герольд, або гербавы кароль. Функцыі (рэпрэзентатыўная, распазнавальная) і прызначэнне герба (атрыбут працэсій, свят, фэстаў, хаўтур; пячаткі, харугвы, будынкі, надмагіллі, зброя, кніжныя выданні і інш.). Паняцці "поле", "выява", "легенда". Дзяленне тарка і парадак чытання гербаў. Геральдычныя колеры. Колеры дзяржаўнай сімволікі. Нацыянальныя сімволіка колераў. Ідэйны і іканаграфічны генезіс герба ВКЛ "Пагоня". Гісторыя ўзнікнення і сімволіка харугваў, сцягоў. Кампазіцыя, каларыстыка, сімволіка герба і сцяга Беларусі. Судачыненні колераў герба і сцяга. Гімн. Паняцце "пячатка", варыянты і функцыі пячатак. Выкарыстанне дзяржаўнай сімволікі ў святочнай культуры.

*Каралеўская, велікакняжацкая, княжацкая, магнацкая, шляхецкая сімволіка.* Каралеўская і велікакняжацкая сімволіка (геральдычны знак; карона, берла, дзяржава, мантыя). Рыцарская сімволіка (геральдычны знак; меч, пас, астрогі). Магнацкая сімволіка. Гербы прыватных асоб (родавыя, прыватныя і асабістыя). Гарадзельская унія 1413 года і прыняцце шляхецкімі родамі фамільных гербаў. Правілы надання і стварэння гербаў. Дрэва роду. Харугвы панцырных баяр. Законы выкарыстання сімволікі.

*Гарадская геральдыка, карпарацыйная сімволіка.* Гісторыя з'яўлення гарадской геральдыкі Беларусі. Магдэбургскае права і сімволіка вольнага горада (герб, ратуша, магістрат, пячатка, харугва, гадзіннік і інш.). Гербы беларускіх гарадоў XIV - XVIII стст. Прычыны змены і уніфікацыі гарадской геральдыкі з канца XVIII ст. Дзяржаўная і гарадская геральдыка савецкіх часоў (1917 - 1991 г.) Сучасная сімволіка горада. Цэхавая і брацкая сімволіка (герб і цэхавы знак, пячатка, харугва, статут, прывелеі і інш.). Сучасная прафесійная сімволіка.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Народная сімволіка.* Сімволіка міфалагічных вобразаў. Тэматыка паганскай міфалогіі і яе сімвалы-вобразы: мадэль Сусвету, Зямля, Неба, Дрэва жыцця; сакральныя знакава-сімвалічныя матывы і візуальна-знакавыя архетыпы (Сусвет, Дрэва жыцця, Маці, Адраджэнне, Жыццё, Урадлівасць, дамашні Рай, Змей-дракон, алень, птушка і інш.). Беларускі традыцыйны арнамент (геаметрычны, раслінны, зааморфны і антрапаморфны) і яго сімволіка. Сімволіка колераў у традыцыйнай народнай культуры, у тым ліку арнаменце. Жыццёва-абрадавае кола і сімволіка лічбаў у традыцыйнай культуры беларусаў. Сімвалічная атрыбутыка Калядаў, Гукання вясны, Купалля, Багача, Дзядоў і іншых каляндарных абрадаў і свят. Сімволіка рэчаў дэкаратыўна-ўжытковага мастацтва.

Каноны *канфесійнай сімволікі.* Канфесійная сімволіка. Храмавая архітэктура, кананічныя кнігі, візуальная атрыбутыка (абразы, скульптура, свяшчэнныя словы і да т.п.), рытуальнае адзенне. Хрысціянская, будзыйская і іншая сімволіка колераў. Традыцыі выкарыстання канфесійнай сімволікі ў святочных дзеях.

*Сучасная сімволіка* грамадскіх, палітычных, прафесійных, спартыўных, маладзёжных, творчых і іншых арганізацый (1917 – 2005 гг.). Сімволіка прадпрыемстваў і іх вырабаў. Эмблемы і лагатыпы. Сімволіка ў вобразным мастацка-дэкаратыўным вырашэнні палітычных, гістарычных, фальклорных, спартыўных і іншых свят ХХ ст.

*Сімволіка і яе месца ў сцэнаграфіі свята.* Паняцце “сімволіка свята”. Патрабаванні да збору матэрыялу для стварэння сімволікі свята. Крытэрыі ацэнкі, знакавасць і інфармацыйная насычаснасць; мастацкія вартасці сімволікі ў мастацка-дэкаратыўным вырашэнні свята. *Выкарыстанне геральдыкі* ў свяце. Падбор матэрыяла на тэматычнае свята, абранае студэнтам. Гербы, сцягі, звязаныя з геральдыкай уладальнікаў горада, замка. Легенды, гістарычныя факты і іх выкарыстанне ў свяце.

**Тэма 2. Матэрыяльная культура Беларусі ў кантэксце сучаснага свята.**

*Архітэктура Беларусі.* Культавыя помнікі, замак-палац, горад, мястэчка, вёска (узнікненне, маркіроўка, сацыяльная прыналежнасць і інш.). Культавае дойлідства, знакавасць, сімволіка, стылістыка. Старадаўнія паганскія

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

сакральныя (культавыя) святыні Беларусі, легенды і паданні пра іх. Паходжанне назваў гарадоў, вёсак і г.д., легенды і паданні. Старадаўнія прозішчы і імёны. Асноўныя стылі, уласцівыя культаваму мастацтву Беларусі. Мецэнацтва. Іеарахічнасць і супадпарадкаванасць. Асаблівасці *горадабудаўніцтва* Беларусі (гандлёвы пляц, ратуша, гандлёвыя рады, канфесійныя святыні).

*Замкі, палацы і сядзібныя ансамблі Беларусі.* Узнікненне, сацыяльная прыналежнасць, сімвалічнае і функцыянальнае значэнне. Каралеўскія і вялікакняжацкія замкі і палацы. Замкі і палацы магнатаў ВКЛ. Стылістыка. Замкавы і палацавы інтэр'ер. Шляхецкія маёнткі Беларусі, інтэр'ер шляхецкага дома. Садова-паркавае мастацтва Беларусі.

*Народнае дойлідства Беларусі.* Паняцці "дом", "сядзіба", "хата", "гаспадарчыя пабудовы". Традыцыйныя месцы пабудовы (стаўленне да вады, дарогі, перакрыжаванняў і інш.). Асаблівасці аб'ёмнага планавання сядзібы (вяночная, пагонная сістэма, хаатычны тып, змешаны тып). Гісторыка-этнагарафічныя асаблівасці народнага дойлідства на тэрыторыі Беларусі. Вонкавае аздабленне сядзібы і хаты: франтон, вільчак, аканіцы; салярныя знакі і іншыя абярэгі. Духі-насельнікі сядзібы, поля, агароду.

*Хата, інтэр'ер хаты і яго сімволіка*. Абрадавыя дзеянні пры выбыры месца пабудовы, будова і абжыванне хаты. Сімволіка дома па вертыкалі і гарызанталі. Інтэр'ер хаты і яго сімволіка. Агонь духоўны (чырвоны кут) і агонь Роду (печ). Сімволіка печы па вертыкалі. Сімвалічны падзел прасторы хаты. Духі-насельнікі хаты. *Хатняе начынне і яго сімволіка.* Сімволіка і семантыка побытовых рэчаў ў святочнай культуры і ў штодзённым жыцці. Касмалогія (качарга, засланка, патэльня, рэшата), дэманалогія (жырандоль, венік), касмагонія (грэбень, хлебная лапата), антрапамарфізмы (гаршчок, дзяжа, лыжка), эратызмы (ступа і таўкач, хамут). Прылады працы і іх сімволіка (нож і сякера, серп, іголка, барана і інш.). Дэкаратыўна-прыкладное мастацтва Беларусі і яго месца ў штодзённай і святочнай культуры. Майстэрня каваля як фактар паратэатральнага дзеяння. Рэгіянальныя асаблівасці і цэнтры вытворчасці.

*Формы выкарыстання матэрыяльнай культуры Беларусі ў сцэнаграфіі сучаснага свята.* Інтэр'ер, творы дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва як сцэнаграфічны сродак гістарычнай і сацыяльнай характарыстыкі падзей,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

персанажаў у паратэатральным дзеянні. Сцэнаграфія "Раскіданага гнязда" па п'есе Я. Купалы ў пастаноўцы Рускага драматычнага тэатра.

**Тэма 3. Беларускі гістарычны касцюм, зброя і матэрыяльная культура магнатэрыі, шляхты і гараджан.**

*Паняцці "нацыянальны", "народны", "гістарычны" касцюм.* Гістарычны касцюм, ідэал прыгажосці, стылістыка. Аўтэнтычны касцюм, яго рэканструкцыя, рэстаўрацыя. Сцэнічны касцюм. Касцюм і яго месца ў жыцці, у традыцыйнай святочнай культуры, у сучасных паратэатральных дзеях.

*Перыядызацыя беларускага гістарычнага касцюма* як найбольш выразны паказчык шляхоў развіцця беларускіх земляў. Адрозненні ў развіцці і перыядызацыі гісторыі развіцця касцюмаў на тэрыторыі Беларусі, Еўропы і Расіі.

*Касцюм, зброя, побыт на тэрыторыі Беларусі ў VI – X стст.* Ідэал прыгажосці, кропкі сілы на целе чалавека, адзенне, асаблівасці ўпрыгажэнняў крывічоў, дрыгавічоў, радзімічаў і іншых славянскіх і балцкіх плямёнаў. Сімволіка арнаменту, амулетаў і абярэгаў. Ідэал прыгажосці і парадна-цырыманіяльны касцюм князя і княгіні X – XIII стст. Сімвалы ўлады. Залатыя ўпрыгожанні Беларусі X - XIII стст.

*Касцюм, зброя і побыт ВКЛ. Готыка* ў касцюме ВКЛ XIII –XV стст. Кантраст і вертыкалізм у адзенні і каларыстыцы. Сімвалы ўлады (карона, берла, дзяржава; вялікакняжацкая карона, мантыя, меч, пас, астрогі). Геральдычнае адзенне. Развіццё ідэалу прыгажосці і жаночай моды выключна ў рэчышчы еўрапейскай моды. Святарскае і манаскае адзенне розных канфесій. Ідэал прыгажосці эпохі *Адраджэння.* Вялікакняжацкі і магнацкі касцюм, зброя, побыт XVI ст.. Матэрыяльная культура ВКЛ эпохі Адраджэння паводле гравюр Францыска Скарыны. *Барока і ракако. Культура сарматызму*. XVII – XVIII стст. Партрэтныя галерэі і "дамашнія музеі". Росквіт калекцыяніравання, мецэнацтва, жыццяпісу. Агульнапрынятая еўрапейская мода. Сармацкі партрэт (канцэпцыя, сімволіка). Сармацкі касцюм. Залотнае ткацтва на Беларусі, слуцкія паясы. Шпалернае мастацтва Беларусі.

*Касцюм, зброя і побыт XIX –XX стст.* Класіцызм. Рамантызм. Шляхецкая культура маёнткаў XIX ст. Эклектыка, мадэрн, імпрэсіянізм,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

рэалізм, сімвалізм у беларускім мастацтве і матэрыяльнай культуры XIX - пач. XX ст. Існаванне побач з модай на агульнаеўрапейскае свецкае адзенне традыцыйнага рытуалу і моды на старашляхецкія кунтушовыя строі, зброю да I пал. XX ст. Соцрэалізм.

**Тэма 4. Беларускі традыцыйны касцюм.**

*Святочна-рытуальны беларускі строй* (сямейна-абрадавы) і *штодзённы касцюм.* Вясельныя строі і іх сімволіка. Пахавальная абраднасць і яе сімволіка ў строі і ручніках. *Каляндарна-абрадавы* касцюм і ўзроставы цэнз касцюма традыцыйных святочных дзей (Калядкі – дзеці, Калядныя вячоркі, Гуканне вясны, Купалле – моладзь і маладухі, Жніво – сталыя, Дзяды – старцы). Арнамент як сімвалічны код у касцюме.

*Семантыка беларускага народнага строю і яго элементаў.* Нітка (ніць жыцця, лёсу), тканіна (рытуальныя тканіны). “Космас” традыцыйнага беларускага адзення. Космас-дом-чалавечае цела. Цела – космас - рытуал. Магічная сіла голага цела і валасоў, чалавечага цяпла. Адзенне - паказчык палавой, класавай, сацыяльнай прыналежнасці. Першае адзенне дзіцяці (новае палатно і чырвоная нітка), другое нараджэнне (праз рукаў, штаніну і інш.). Узроставае апрананне хлопчыкаў і дзяўчынак, стрыжка. Семантыка, семіётыка, сімволіка кашулі, шапкі, фартуха, нагавіц, кажуха, лапцяў. Магія адзення. Выкарыстанне знакавасці адзення ў традыцыйнай і сучаснай штодзённай і святочнай культуры.

*Лакальныя асаблівасцці беларускага народнага строю.* Элементы мужчынскага і жаночага народнага строю і рэгіянальныя адметнасці. Галаўныя ўборы, фрызуры ў беларускім народным строі, іх семантыка. Сезонны касцюм. Касцюм сацыяльных груп насельніцтва (валхвы, дзеці, старцы і г.д.). Рысы гісторыі і сувязь беларускага народнага адзення з традыцыямі адзення народаў Еўропы: ідэал прыгажосці, структура касцюма, элементы свецкай моды XV-XIX стст. (гарсэт, андарак і інш.), каларыстыка, упрыгожанні, абутак.

*Адзенне нацыянальных меншасцей Беларусі.* Традыцыйная вопратка яўрэяў, татар, цыган, рускіх і інш. Этнічныя ўзаемаўплывы. Касцюм і асоба. Выкарыстанне адметнасцей адзення, фрызуры пры стварэнні сцэнічнага вобраза. Персанажы *народнай міфалогіі*, іх знешні вобраз-“касцюм” і яго

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

сімволіка.

## Раздзел II. Сцэнаграфія свята

### Тэма 5. Сцэнаграфія сучаснай святочнай культуры Беларусі.

*Сучасная святочная культура Беларусі.* Агляд сцэнаграфіі свят, мастацкія і іншыя праблемы сцэнаграфіі. Сучасны беларускі нацыянальна-народна-сцэнічны вобраз. Мастацкія, тэматычныя дасягненні і праблемы. Увасабленне эпохі на тэатральнай сцэне. Гістарычная і народная тэматыка ў выяўленчым мастацтве, кіно. Гістарычная тэматыка масавых паратэатральных дзей.

*Выкарыстанне здабыткаў матэрыяльнай культуры Беларусі ў кантэксце сучаснага свята* (аўтэнтыка, рэканструкцыя, рэстаўрацыя; сімвалізм, знакавасць і інш.). Знакі-сімвалы культуры Беларусі і іх увасабленне ў сучаснай святочнай прасторы. *Месца традыцыйнай народнай культуры* і яе знакавасць ў сучаснай святочнай прасторы Беларусі. Традыцыі і штампы ў сцэнаграфіі сучасных народных свят. Сімвалічная атрыбутыка Каляд, Купалля, Гукання вясны, Дзядоў.

*Сцэнічны касцюм у свяце.* Касцюм і жанр свята. Касцюм ў тэатралізаваным відовішчы - сродак пераўтварэння персанажаў. Умоўнасць. Абагульненне і ўзбуйненне формы. Сілуэт. Дэталь замест цэлага. Трансфармацыя аб’ёму, сілуэта, колеру, вобраза.

Гісторыя станаўлення беларускага сцэнічнага касцюма. Касцюмы сярэднявечных дзей, касцюмы прыдворных тэатраў князёў Радзівілаў, Сапегаў, школьнага тэатра XVII – XVIII стст., тэатраў В. Дуніна-Марцінкевіча,

І. Буйніцкага і У. Галубка. Стварэнне беларускага народнага хору і ўплыў на далейшае развіццё народна-сцэнічнага касцюма. Стварэнне шматпланавых прафесійных калектываў і масавае развіццё мастацкай самадзейнасці ў 50-60 гады ХХ ст. Стварэнне ў 1958 г. спецыялізаванага камбіната па вытворчасці сцэнічных касцюмаў пры Беларускім тэатральным аб’яднанні (з І990 г. Саюз тэатральных дзеячаў). Дзейнасць Рэспубліканскага савета па сцэнічным касцюме пры Міністэрстве культуры (1981 - 1986 гг). Даследчая і творчая дзейнасць

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Л. Баразны і М. Раманюка ў галіне сцэнічнага касцюма. Станаўленне сцэнічнага касцюму Беларусі, звязанага з гістарычнай тэматыкай. Творчасць Л. Баразны,

Ю. Піскуна, А. Александровіч.

*Гістарычныя персанажы.* Касцюм як сродак характарфыстыкі персанажа. Бутафорыя і яе магчамасці для характарыстыкі персанажа. Адпаведнасць часу, калі жыў персанаж, стылістыкі касцюма і бутафорыі. *Персанажы традыцыйных народных свят*. Выкарыстанне ведаў пра рэаніраванне народнай культуры у сучаных святах. Касцюм для персанажаў каляндарна-абрадавых свят. Касцюм у семейна-абрадавых святах. *Міфалагічныя персанажы*. Выкарыстанне ведаў па міфалогіі, традыцыйнай культуры Беларусі пры стварэнні візуальнага вобраза міфалагічнага персанажа.

*Крытэрыі ацэнкі мастацкіх і функцыянальных вартасцей сцэнаграфіі свята.* Рост патрабаванняў да тэматычнай, гістарычнай і этнічнай адпаведнасці, мастацкіх вартасцей сцэнічнага вобраза. Методыка пошуку арыгінальнага мастацкага вырашэння свята. Тэкставое апісанне і візуальная падача матэрыяла для стварэння персанажаў на тры, задуманых студэнтам свята.

**Тэма 6. Каларыстыка. Асновы кампазіцыі.**

*Каларыстыка. Колер*. Трыяда – чырвоны, белы, чорны – і яе стыхіі. Сістэмы стыхій і колераў у розных культурах. Традыцыйная беларуская сімволіка колераў. Колеры ўлады.

Фізічныя і эстэтычныя ўласцівасці колеру. Ахраматычныя і храматычныя колеры. Характарыстыка колеру: тон, светлата, насычанасць. Спектральнае кола. Асноўныя і дадатковыя колеры. Гармонія і дысгармонія колераў. Колеравыя суадносіны. Каларыт. Кантраст і нюанс як прынцыпы каларыстычнай гарманізацыі. Каларыстычная гама свята. Эмацыянальна-псіхалагічнае ўздзеянне колеру: спакой - напружанасць, цяпло - холад, цяжар - лёккасць, мяккасць - жорсткасць і г.д., асацыяцыі, семантыка. Сімвалічная значнасць колеру. Колер як актыўны сродак вобразнай характарыстыкі, які звязаны з ідэяй, стылістыкай, індывідуалізацыяй. Сінтэз колеру і гуку.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Каларыстыка свята.* Зместавая насычаснасць каларыстыкі свята, адпаведнасць тэме і ідэі, вобразнай стылістыцы. Колер як адзін са спецыфічных сродкаў эстэтычнай эмацыянальнай выразнасці, кампанент мастацкага вобраза, сродак характарыстыкі сцэнічных дзей і персанажаў. Кіраванне ўвагай гледача пры дапамозе колеру, прыцягванне ўвагі да персанажаў, рэчаў ці дзеянняў у пэўнай паслядоўнасці: ад галоўнага да другараднага і наадварот. Сімволіка колераў свята. Выкананне ўсіх мастацка-дэкаратыўных элементаў свята з дамінантай абранай каларыстыкі.

*Паняцце “кампазіцыя”.* Змест формы (лінія, пляма, аб’ём, кампазіцыйная структура). *Катэгорыі кампазіцыі* (тэктоніка, аб’ёмна-прасторавая структура).

Выяўленчая плоскасць: характарыстыкі выяўленчай плоскасці, успрымаемай як паверхня і як прастора. Кампазіцыя на плоскасці. Залежнасць кампазіцыі ад кампазіцыйнай рамы. Узаемадзеянне плоскасці, плямы, лапіны.

Перспектыва як адлюстраванне прасторы на плоскасці. Лінейная перспектыва, перцэптыўная, адваротная, танальная, святлопаветраная. Адлюстраванне ў аксанаметрыі.

Кампазіцыйная структура (тэктоніка) пластычнага руху ў творах выяўленчага мастацтва. Структурныя “сілавыя” лініі, геаметрычныя кампазіцыйныя схемы, нематэрыяльныя, але рэальна адчуваемыя ў якасці арганізуючага каркасу кампазіцыі.

*Уласцівасці і якасці кампазіцыі* (гарманічная цэласнасць, супадпарадкаванасць элементаў, кампазіцыйная раўнавага, адзінства стылю, вобразнасць формы). Шэраг супадпарадкаванняў паміж усімі часткамі цэлага. Гарманічная цэласнасць патрабуе мэтанакіраванага выкарыстання ўсіх сродкаў кампазіцыі. Якасная мера. Колькасная мера. Суразмернасць. Кампазіцыйнае пачуццё меры.

*Заканамернасці кампазіцыі* (сіметрыя, асіметрыя, дынамічнасць і статычнасць, ураўнаважанасць). Сіметрыя. Віды сіметрыі: цэнтральная, прамянёвая, радыяльная, люстэркавая, паралельны перанос, спалучэнне розных відаў сіметрыі. Асіметрыя – аснова дынамічнай напружанай раўнавагі кампазіцыі.

*Сродкі кампазіцыі* (прапорцыі, маштаб, кантраст, нюанс, метрычныя

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

паўторы, рытм). Прапорцыя як адзін з істотнейшых сродкаў для характарыстыкі мастацкага вобраза. Канон Палiклета. Модуль. Залатая прапорцыя. Класічны ордэр у архітэктуры.

Маштаб. Табліца маштабаў. Маштабнасць – суадносіны арганізаванай прасторы з фігурай чалавека. “Чалавек – мера ўсіх рэчаў”. Чалавек – кампазіцыйны модуль мастацкай прасторы.

Вызначэнне рытму і метра. Роля рытму як аднаго са сродкаў гарманізацыі формы. Кампазіцыйная раўнавага, заснаваная на метры, – паказ статыкі. Дынамічна-напружаная раўнавага – паказ руху.

*Арганізацыя дамінантных адносінаў фармальных элементаў кампазіцыі.* Кампазіцыйная актыўнасць асноўных элементаў (персанажаў) фармальнай арганізацыі: кропкі, лініі, плямы, прасторы. Арганізацыя прасторавых сувязей і адносін паміж элементамі кампазіцыі. Адзінства ў арганізацыйнай структуры фармальнай кампазіцыі складаючых яе элементаў і прасторы. Ступень, інтэнсіўнасць і накіраванасць прасторавай актыўнасці сілавога поля элемента (яго канфігурацыя, маштаб, колер, тон, фактура, месца ў прасторы, рух адносна вертыкалі і гарызанталі, узаемадзеянне з іншымі сілавымі палямі і інш.) на навакольную прастору.

*Прыёмы і метады працы над кампазіцыяй.* Выбар асноўнай ідэі кампазіцыі і рэалізацыя яе на ўсіх этапах працы. Стылістычнае адзінства. Псіхафізіялагічнае ўспрыманне кампазіцыйна арганізаванай формы гледачом. Агульныя законы псіхалогіі візуальнага ўспрымання розных формаў. Уменне рэжысёра і мастака свядома кіраваць дынамікай і эмацыянальнай актыўнасцю візуальнага ўспрымання гледача.

**Тэма 7. Сцэнаграфія свята на адкрытай прасторы**.

*Час свята.* Правілы вызначэння часу пачатку і заканчэння свята, найбольш спрыяльных для рэалізацыі творчай задумы рэжысёра-пастаноўшчыка. Адпаведнасць святам, што адбываюцца ў дзяржаве, рэгіёне ў прызначаны для вашага свята час. Адпаведнасць святам па блізкай тэматыцы. Перыядычнасць свята. Гістарычнасць і традыцыйнасць пачатку свята. Час свята і працягласць павінны адпавядаць жыццёвыму цыклу большасці аўдыторыі, асабліва дзіцячыя святы.

*Месца свята.* Мастацка-дэкаратыўнае вырашэнне свята пачынаецца з

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

выбару месца яго правядзення свята або з ацэнкі прыродных ці архітэктурна-мастацкіх вартасцяў прапанаванага месца. Крытэрыі ацэнкі. Культурныя і гістарычныя вартасці месца правядзення свята. Месца традыцыйнага правядзення свята. Выкарыстанне ракі, возера, вуліцы, перакрыжавання вуліц, поля, гары, крыніцы і інш.; паданні, звязаныя з гэтымі месцамі, тлумачэнне ў святочнай дзеі правядзення рытуальных дзеянняў менавіта ў гэтым месцы. Магчымыя месцы правядзення свята на гістарычную ці другую тэматыку (гарадзішча, замак, палац, ратуша, дом губернатара, плошча, гандлёвыя шэрагі і інш.). Выкарыстанне ў святочнай дзеі звестак пра гістарычных асоб і падзей, звязаныя з гэтым месцам, прыпелеі і інш. Пошук месца, якое найбольш адлюстроўвае тэматыку пазаабрадавага свята. Дакладна вызначаная тэрыторыя свята і яе пазначэнне. Зручнасць месца для ўдзельнікаў і гледачоў: сцэнічныя пляцоўкі, глядацкія рады, службы, шляхі, размяшчэнне удзельнікаў і г.д.

*Асяроддзе і антыасяроддзе.* Роля рэжысёра імастака ў пераўтварэнніе пазасцэнічнай прасторы ў прастору масавага тэатра. Аналіз прыродных і архітэктурна-мастацкіх вартасцей месца свята. Асяроддзе. Культурныя, гістарычныя, мастацкія, эстэтычныя якасці асяроддзя свята. Антыасяроддзе. Уключэнне антыасяроддзя ў вобразную тканіну свята праз пераасэнсаванне яго знешняга выгляду: пераўтварэнне ў дамінанту свята або моманту свята (дрэва -- чараўніца, смецце – даліна скарбаў і г.д.); перанос галоўнай пляцоўкі на дыяметральна супрацьлеглы бок і неакцэнтаванне на іх ўвагі (грымёрныя); закрыццё транспарантамі, плакатамі і г.д. Удзел гледачоў у арганізацыі ці рэарганізацыі сцэнічнай прасторы. Рэарганізацыя – акт відовішча, элемент сцэнічнага дзеяння. Правільная арганізацыя сцэнічнай прасторы – умова устойлівага эмацыянальнага кантакту з гледачамі.

Асаблівасці мастацка-дэкаратыўнага вырашэння свята з улікам ландшафту. Асаблівасці мастацка-дэкаратыўнага вырашэння свята ў горадзе (вуліца, плошча). Выкарыстанне ў мастацка-дэкаратыўным вырашэнні свята сінтэзіаванага асяродку горада. Асаблівасці мастацка-дэкаратыўнага вырашэння свята на адкрытай прасторы (лесапаркавая зона, вадаём). Прадметнае асяроддзе (рэльеф, вадаём, унікальны аб’ект) як фактар, што актыўна ўплывае на мастацка-вобразнае вырашэнне свята.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Мастацкая арганізацыя прасторы свята сродкамі сцэнаграфіі.* Кампазіцыйная пабудова свята (архітэктоніка) у мастацка-дэкаратыўным вырашэнні. Канкрэтыка і сімволіка ў мастацка-дэкаратыўным вырашэнні свята. Асацыятыўнасць, абагульненне, умоўнасць. Жанрава-стылістычная адпаведнасць агульнай рэжысёрска-сцэнагарфічнай канцэпцыі свята.

Арганізацыя прасторы свята па гарызанталі. Сцэнічныя пляцоўкі, дэкаратыўныя ўстаноўкі, шэсці і інш. Формы сучаснай сцэны: сцэна-скрыня, сцэна-арэна, сімультанная сцэна, прасторавая сцэна. Уключэнне ў вобразны строй кампазіцыі акрамя сцэнічных аб'ёмаў – прасторы паміж імі. Арганізацыя прасторы свята па вертыкалі. Вырашэнне будынкаў, фасадаў і інш. Актыўнае выкарыстанне прасторы над вуліцай, плошчай, стадыёнам. "Неба" ў дзённай і начной святочнай прасторы (падвесныя элементы, авіяцыя, піратэхнічныя дзеі). Колер як "дысцыплінаванне" сцэнічнай прасторы горада. Узаемадзеянне святла, колеру і гуку.

Архітэктурна-мастацкае вырашэнне малых архітэктурных формаў, (сцэны-эстрады, гульнёвыя і інш. пляцоўкі, гандлёвыя рады, рэкламныя установкі і інш.) у кантэксце свята. Рэалізацыя сцэнаграфічных праектаў штучнага асяроддзя. Дзве стадыі рэалізацыі: эскізная і выканаўчая. Спецыфіка працы і ацэнкі праектаў і эскізаў, выкананых паводле іх пано, бутафорыі і да т.п. Мастацка-тэхналагічны ўзровень выканання.

*Спецыфіка выразных сцэнаграфіі свята на адкрытай прасторы.* Дэкарацыя – прыцягальная сіла і сродак канцэнтрацыі ўвагі глядацкай аўдыторыі. Формы, прыёмы, спосабы арганізацыі глядацкага ўспрымання: першаснасць відовішча, дамінанта візуальных сродкаў, працягласць мізансцэн, мінімальнае выкарыстанне акцёрскага майстэрства, знак -- сімвал, рух – гук -- святло, глядач -- удзельнік. Памер пляцоўкі, рэальнасць навакольнага асяродку.

Масавыя відовішчы – тэатр масы. Стварэнне выяўленчых кампазіцый, якія бесперапынна развіваюцца ў часе і прасторы. Дамінанта маштабных дынамічных кампазіцый з тысячаў выканаўцаў, адзінкавых герояў, буйнамаштабных лялек, палотнішчаў, планшэтаў, транспарантаў, піратэхнічных эфектаў і інш. Сімвалічныя вобразы-алегорыі. Пластычная, каларыстычная і інш. арганізацыя ўзаемадзеяння саліста і масы, героя і натоўпу.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Пабудова, шыхтаванне і разлік фігур на плошчы, стадыёне, адкрытай пляцоўцы. Пабудова і разлік фігур на сцэнічнай пляцоўцы. Прынцыпы размяшчэння актораў і гледачоў у адносінах адзін да аднаго (асявы і цэнтравы) на сцэне-кодабе. “Правы” і “левы” выхады актораў. Цэнтравы прынцып размяшчэння актораў і гледачоў на прасторавай сцэне.

**Тэма 8. Сцэнаграфія свята ў закрытым памяшканні.**

*Арганізацыя перад-, святочнай і постсвяточнай атмасферы свята мастацка-дэкаратыўнымі сродкамі.* Выкарыстанне неабходных і магчымых сцэнічных пляцовак – прасторы вулічнай плошчы, хола, памяшканняў у комплекснай сцэнаграфіі свята. Завязка, кульмінацыя, развязка як неабходныя элементы сцэнічнай і мастацкай пабудовы. Жанравасць. Дынамічнасць, вастрыня сюжэта, таямніца, напружанне дзеяння, выключнасць герояў, кантраст і інш. Сцэнічная ўмоўнаць.

*Наладжанне сцэны і закуліснай прасторы.* Класічны кодаб сцэны. Залатое сячэнне як прынцып вымярэння кодаба сцэны. Наладжванне сцэны і закуліснай прасторы. Асноўныя элементы сцэны: планшэт і сцэнічная гульнёвая прастора, верхняя сцэна, ніжняя сцэна (трум), авансцэна, сцэнічныя кішэні, ар’ерсцэна, каласнікі, аркестравая яма, дапаможныя памяшканні сцэны (кішэні), галаснікі.

Планы сцэны: авансцена, цэнтр, пакат.

*Тэхнічнае абсталяванне і механізацыя сцэны.* Наладжванне і функцыі механічнага абсталявання (кулісныя машыны, штанкетныя пад’ёмы, вярчальная сцэна, колы, фуркі, пад’емна-апускальныя пляцоўкі, транспарцёры, тэлары, люк, трум і інш.).

Планшэт і яго механізмы. Канструкцыя планшэта сцэны; пад’ёмна-апускальныя планы сцэны; пад’ёмна-апускальныя пляцоўкі сцэны; рухомыя планшэты сцэны (кругі ўрэзаныя, накладныя, барабанныя); рухомыя колы; транспарцёр; адтуліны і люкі; кулісныя машыны; накладны планшэт сцэны; накатныя пляцоўкі і рухомыя планшэты. *Верхняе абсталяванне сцэны*. Штанкетныя пад’ёмы; індывідуальныя пад’ёмы, палётныя ўстаноўкі. Сістэма індывідуальных пад’емаў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Адзенне сцэны. Кулісы, падугі, заднікі. Заслоны. Віды заслон па функцыі: антрактныя і інтэрмедыйныя. Па тэхніцы: пад'ёмна-апускальныя, камбінаваныя, фігурныя. Панарамы і гарызонты. Пад'ёмна-апускальны і перасоўны гарызонт. Іграві заднік сцэны, генеральная заслона. Шырмы, шторы.

Дэкарацыі. Цвёрдыя дэкарацыі. Павільённыя дэкарацыі, станкі, лесвіцы, парэнчы, балюстрады, аб'ёмна-каркасныя дэкарацыі. Мяккія дэкарацыі. Адзенне сцэны (кулісы, паддугі, раздзержкі), заслона, жывапісныя фоны (заднікі), шырмы і варыянты іх размяшчэння ў прасторы. Пейзажныя, інтэр'ерныя і інш. дэкарацыі.

Бутафорыя. Тэатральная мэбля. Тэатральныя фактуры і імітацыя. Прасцейшыя тэхналогіі распрацоўкі, пабудовы, зборкі, мантажу павільённай дэкарацыі.

Святло. Асвятленне. Каляровае асвятленне: святлафільтры, каляровыя трансфармацыі, асвятленне дэкарацый, лакалізаванае асвятленне. Праекцыі: асвятленне сцэны пры праекцыі, экран, барэльефныя праекцыі, кіно. Імітацыя і эфекты (з'явы прыроды, агонь).

*Мастацкая арганізацыя прасторы свята ў закрытым памяшканні сродкамі сцэнаграфіі.* Этапы працы рэжысёра і мастака-дэкаратара (збор матэрыялу, эскізы дэкарацый, макет дэкарацый, выкананне ў матэрыяле). Мізансцэны. Галоўная сцэнічная пляцоўка. Скрыня сцэны і чалавек-модуль. Асаблівасці дэкарацыйнага афармлення ў закрытым памяшканні: лінейная перспектыва ў рэальнай прасторы; паветраная перспектыва, дасягнутая прапорцыямі, фактурай дэкарацыі, света-гука аздобай і г.д.; чалавек на сцэне ў бесперапынным руху і інш. Архітэктурны і сцэнічны план сцэнічнай прасторы. Прамяні бачнасці сцэнічнай прасторы, рамы, авансцэны, кулісы, люстэркавыя лініі. Сцэнічныя планы і іх пабудова.

*Роля касцюму, бутафорыі ў мастацка-дэкаратыўным вырашэнні свята ў закрытым памяшканні.* Касцюм, грым, аксэсуары, творы дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, мэбля як сродак вобразнай характарыстыкі герояў. Прадметы этнаграфіі і народна-прыкладнога мастацтва, гісторыка-пабытавы касцюм ў вобразна-мастацкім вырашэнні свята.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**Тэма 9. Сімволіка свята.**

*Сімволіка свята.* Асноўныя прынцыпы пабудовы сімволікі свята:

а) візуальнае стылізаванае адлюстраванне тэмы і мэты свята; б) візуальны рад (знак-сімвал, абрысы горада, асобнага будынка, картаграфія, партрэт, элементы каралеўскай, гарадской і іншай сімволікі, элемент агульнавядомага культурнага феномена (слуцкія паясы, гравюры Ф. Скарыны), тэкст, аўтограф і інш.;

в) абрамленне: картуш (дзяржаўная, гістарычная сімволіка), геаметрычныя формы (кола, авал, барочныя формы), раслінныя (віньеткі, вянкі, гірлянды, лісце, каласы, кветкі і інш.); г) легенда, дэвіз, дата; д) адпаведнасць стылістыцы свята; е) адпаведнасць каларыстыцы свята.

Недапушчальнасць паралельнага ужывання дзяржаўнай, магнацкай, гарадской, народнай сімволікі. Недапушчальнасць натуралізму як у сімволіцы, так і ў афармленні свята. Асаблівасці і правілы пабудовы сімволікі дзяржаўнага, канфесійнага свята, тэматычнага свята, свята, прысвечанага класічнай тэматыцы, спартыўнага свята, дзіцячага свята і інш. Выкарыстанне ў сімволіцы свята традыцыйных сімвалаў (паганская сімволіка, элементы арнаменту, агульнапрынятая сімволіка народных свят): калядная зорка, вогнішча, птушка, свечка, хлеб на ручніку, зерне, сноп і інш.; элементы народнага побыту – ручнік, жбанок, калодзеж-жораў; прынятыя сімвалы: бусел, зубр і інш.

*Стылістычнае адзінства* мастацка-дэкаратыўнага вырашэння свята. Паняцце “стылістыка”, “стылістычнае адзінства”. Адпаведнасць колера, кампазіцыі, сімволікі, сцэнаграфіі абранай стылістыцы свята.

*Жанравыя асаблівасці сцэнаграфіі свята: каляндарна-абрадавых свят, тэматычных, дзіцячых, спартыўных.* Выбар месца і часу правядзення свята і собных комплексаў свята згодна з жанравымі асаблівасцямі, тэматыкай, узроставай катэгорыяй гледачоў. Асаблівасці сцэнаграфічнага аздаблення пляцовак каляндарна-абрадавых, дзіцячых і інш свят. Актывізацыя гледача пры дапамозе сцэнаграфіі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Раздзел III. Работа мастака-пастаноўшчыка над комплекснай сцэнаграфіяй свята

### Тэма 10. Творчая група сцэнаграфіі свята і галоўныя прынцыпы яе работы.

*Аргкамітэт свята, яго склад і задачы структурных падраздзяленняў.* Творчая садружнасць рэжысёра і мастака. Сінтэз сцэнаграфіі і рэжысуры. Творчая група сцэнаграфіі свята, склад, функцыянальныя абавязкі ўдзельнікаў і галоўныя прынцыпы працы.

*Паслядоўнасць і асноўныя этапы сцэнаграфічнага вырашэння свята.* Шлях ад задумы да эскізных распрацовак. Роля рэжысера ў падачы матэрыяла для сцэнаграфічнага вырашэння свята. Складанне дакументацыі. Паслядоўнасць сагласавання.

### Тэма 11. Складанне праекта комплекснай мастацка-дэкаратыўнага вырашэння свята.

*Назва свята. Тэма, мэта, задачы* свята.

*Месца і час* свята.

*Каларыстыка* свята. Каларыстычная палітра як сродак выяўлення задумы свята. Колер у вобразна-мастацкім аблічы свята. Суадносіны колераў на свяце. Каларыстычная карта свята.

*Кампазіцыя свята.* Лінейная кампазіцыя. Пласкасная кампазіцыя.

*Эмблема* свята (знак-сімвал, колеры, прынцыпы пабудовы).

*Генеральны план* тэрыторыі свята і памежных тэрыторый. *Макет* (аксанаметрыя, перспектыва) тэрыторыі і галоўных пляцовак свята. Эскіз і макет – рознасць іх функцый. Некаторыя прыёмы выканання эскізаў: камп'ютэрная графіка, жывапіс, графіка, аэраграфія, камбінаваная тэхніка. Макет як сродак прасторавага праектавання мастацка-дэкаратыўнага вырашэння свята. Тры стадыі распрацоўкі макета-выгарадкі: планіроўка, чарнавая выгарадка, чыставая выгарадка. Камп'ютэрная графіка.

Эскізная *распрацоўка асобных комплексаў* свята (пляцовак, шэсцяў і інш.)

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**Тэма 12. Рэкламна-інфармацыйны матэрыял свята.**

Стварэнне перад-, святочнай і постсвяточнай атмасферы свята. *Мэты рэкламы:* прыцягнуць увагу, паведаміць мэту, канцэпцыю свята, сабраць гледачоў, падрыхтаваць гледача да ўспрымання дзеяння. Рэклама можа паведамляць неабходныя інфармацыйныя, гістарычныя і інш. звесткі, калі свята адбываецца ўпершыню. Прызавы фонд. Стварэнне постсвяточнай атмасферы, сувенірная і іншая прадукцыя.

*Віды рэкламы:* візуальныя формы; сродкі массавай інфармацыі; запрашэнні адрасныя і персанальныя; гульнёвыя (запрашэнне, міні канцэрт); нетрадыцыйныя (падрыхтоўка месца свята, паветраныя шары, транспарт) і інш. Форма рэкламы і запрашэння можа быць звязана з праграмай свята (каталожны варыянт).

*Прынцыпы рэкламы*: інфармацыйнасць; выразнасць тэматыкі, сімволікі свята; стылістычнае адзінства; псіхалагічнае ўздзеянне на гледача; прафесіяналізм; арыгінальнасць задумы, знаходкі.

**Тэма 13. Крытэрыі ацэнкі мастацкіх вартасцей эскізаў і выкананых работ.**

Арыгінальнасць і аргументаванасць абраных ідэі, тэмы, мэты, назвы свята. Адпаведнасць іх тэматыцы і *мэтазгоднасць абраных месца і часу свята.* Выкарыстанне асаблівасцей традыцыйнай і сцэнічнай культуры папярэдніх пакаленняў.

*Арыгінальнасць* мастацкага аблічча свята і *цэласнасць* яго ўнутранай структуры. Здольнасць у яснай лагічнай форме пабудаваць у адпаведнасці з пастаўленымі задачамі змест будучага кампазіцыйнага твора. Адпаведнасць мастацка-дэкаратыўнага афармлення свята ідэі свята, мастацкае адлюстраванне яе зместавай сутнасці і спецыфікі.

*Стылістычнае адзінства* ўсёй сцэнаграфіі свята.

*Інфармацыйнасць* мастацкага афармлення свята. Выкарыстанне ў мастацка-дэкаратыўным вырашэнні свята ведаў і сабраных факталагічных і візуальных матэрыялаў па гісторыі, фальклоры, этнаграфіі, мастацтве, дэкаратыўна-прыкладным мастацтве вашай мясцовасці; выкарыстанне мастацкіх і іншых адметнасцей вашай мясцовасці на розных этапах свята.

*Прапрацоўка* і высокая мастацкая культура аб’ёмна-пластычнага

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

выкання кампазіцыйнага твора. Адпаведнасць выкананых работ эскізам, рэжысёрскай і мастацкай задуме, канструктарскім, тэхналагічным і іншым распрацоўкам.

**Тэма 14. Работа над сцэнаграфіяй дыпломнай пастаноўкі.**

Пошук арыгінальнага мастацкага ўвасаблення свята.

Афармленне дакументацыі для стварэння мастацка-дэкаратыўнага вырашэння свята.

Арганізацыйна-творчыя пытанні рэалізацыі сцэнаграфіі дыпломнай пастаноўкі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**Літаратура**

Асноўная


1. Афанасьев, Д.В. Пространственное оформление спектакля / Д.В.Афанасьев. – Л.: Искусство, 1990. – 140 с.
2. Базанов, В.В. Техника и технология сцены / В.В.Базанов. – Л.: Искусство, 1976. – 193 с.
3. Валодзіна, Т.В. Семантыка рэчаў у духоўнай спадчыне беларусаў / Т.В.Вало-дзіна. – Мн.: Тэхналогія, 1999. – 167 с.
4. Гісторыя беларускага мастацтва: У 6-ці т. Т.1: Ад старажытных часоў да другой паловы XVI ст. – Мн.: Навука і тэхніка, 1987. – 304 с.
5. Гуд, П.А. Беларускі купальскі комплекс і семантыка абрадавых дзей / П.А.Гуд. – Мн.: Тэхнапрынт, 1999. – 221 с.
6. Дэкаратыўна-прыкладное мастацтва Беларусі XII -- XVIII стагоддзяў: альбом / аўт. тэксту і склад. Н.Ф. Высоцкая. – Мн.: Беларусь, 1984. – 235 с.
7. Жывапіс Беларусі XII – XVIII стагоддзяў: Фрэска. Абраз. Партрэт / склад.: Н.Ф.Высоцкая і інш. – Мн.: Беларусь, 1980. – 315 с.
8. Кацар, М.С. Беларускі арнамент. Ткацтва. Вышыўка / М.С.Кацар. -- Навук. рэд. Я.М.Сахута. – Мн.: БелЭн, 1996. – 208 с.
9. Крук, І.І. Сімволіка беларускай народнай культуры / І.І.Крук. – Мн.: Ураджай, 2001. – 350 с.
10. Кулагин, А.И. Архитектура дворцово-усадебных ансамблей Беларуси / А.И.Кулагин. – Мн.: Наука и техника, 1981. – 134 с.
11. Лебедев, М. Режиссёр – художник, художник – режиссер / М.Лебедев, Е.Вандалковский. – М.: Молодая гвардия, 1987. – 121 с.
12. Локотко, А.И. Нацыянальныя рысы беларускай архітэктуры / А.И.Локотко. – Мн.: Навука і тэхніка, 1999. – 336 с.
13. Миронова, Л.Н. Учение о цвете / Л.Н.Миронова. – Мн.: Выш. шк., 1993. – 463 с.
14. Молчанова, Л.А. Очерки материальной культуры белоруссов XVI -- XVIII вв. / Л.А.Молчанова. – Мн., 1981. – 212 с.
15. Немиро, О.В. Праздничный город. Искусство оформления праздников. Историия и современность / О.В.Немиро. – Л.: Искусство, 1987. – 96 с.
16. Пластыка Беларусі XII – XIII стагоддзяў: Альбом / Аўт. тэксту і склад. Н.Ф.Высоцкая. – Мн.: Беларусь, 1983. – 231 с.
17. Раманюк, М.Ф. Беларускае народнае адзенне / М.Ф.Раманюк. – Мн.: Беларусь, 1981. – 473 с.
18. Сахута, Я.М. Беларускае народнае мастацтва / Я.М.Сахута. – Мн.: Беларусь, 1980. – 215 с.
19. Тананаева, Л.И. Сарматский портрет / Л.И.Тананаева. – М.: Наука, 1979. – 303 с.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

20. Фадзеева, В.Я. Беларускі ручнік / В.Я. Фадзеева. – Мн.: Полымя, 1994. – 327 с.
21. Цітоў А.К. Гарадская геральдыка Беларусі / А.К.Цітоў. – Мн.: Полымя, 1989. – 207 с.
22. Цітоў, А.К. Сфрагістыка і геральдыка Беларусі / А.К.Цітоў. – Мн.: РІВШ БДУ, 1999. – 176 с.
23. Чантурия, В.А. История архитектуры Белорусии / В.А.Чантурия. – Мн.: Вышэйш. шк., 1985. – 319 с.
24. Чернышев, О.В. Формальная композиция. Творческий практикум / О.В.Чернышев. – Мн.: Харвест, 1999. – 312 с.
25. Шароев, И.Г. Режиссура эстрады и массовых представлений / И.Г.Шароев– М.: Искусство, 1986. – 123 с.
26. Шверубович, В.В. Режиссер и оформление спектакля / В.В. Шверубович. – М.: Искусство, 1955. – 234 с.
27. Этнаграфія Беларусі: Энцыклапедыя. – Мн.: Бел Эн,1989.

Дадатковая

1. Археалогія і нумізматыка Беларусі: Энцыкл. – Мн.:БелЭн., 1993. – 702 с.
2. Васильев-Вязьмин, И.И. Искусство людных площадей / И.И. Васильев-Вязьмин. – М.: Искусство, 1977. – 124 с.
3. Васілевіч, У.А. Міфы бацькаўшчыны / У.А.Васілевіч. – Мн.: БелЭн., 1994. – 109 с.
4. Градова, К.В. Театральный костюм / К.В.Градова. -- Т.2. – М.: Искусство, 1987. – 143 с.
5. Градова, К.В. Театральный костюм / К.В.Градова, Е.А.Гутина. -- Т.1. – М.: Искусство, 1976. – 132 с.
6. Грыгор’еў М. Войска ВКЛ ад Саксаў да Касцюшкі / М.Грыгор’еў. – Мн., 1994. — 34 с.
7. Зайкоўскі, Э.М. Жыватворныя крыніцы Беларусі / Э.М.Зайкоўскі, Л.У.Дучыц – Мн.: Ураджай, 2001.– 111 с.
8. Караткевіч, У. Зямля пад белымі крыламі: нарыс / У.Караткевіч. – Мн.: Маст. літ., 1977. – 176 с.
9. Каталіцкія храмы на Беларусі: Энцыклапедычны даведнік / А.М.Кулагін; Маст. І.І. Бокі. – Мн.: БелЭн., 2001. – 216 с.
10. Кирсанова, Р.М. Сценический костюм и театральная публика в России XIX века/ Р.М.Кирсанова. – М.: Артист.Режисёр.Театр., 1997. – 384 с.
11. Локотко, А.И. Пад стрэхамі прашчураў / А.И.Локотко. – Мн.: Полымя, 1995. – 384 с.
12. Ляўкоў, Э.А. Маўклівыя сведкі мінуўшчыны / Э.А.Ляўкоў. – Мн.: Навука і тэхніка, 1992. – 215 с.
13. Малішэўскі, У.А. Нашы гарады / У.А.Малішэўскі, П.М.Пабока. – Мн.: Нар. асвета, 1991. – 303 с.
14. Маслова, Г. Народная одежда в восточно-славянских

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

традиционных обычаях и обрядах XIX – начала XX века / Г.Маслова. – М.: Искусство, 1984. – 123 с.

15. Мерцалова, М.Н. Костюм разных времён и народов / М.Н.Мерцалова. В 4-х томах. Т. 1.– М.: Академия моды, 1993. – 543 с.

16. Мюллер, В.Н. Декорационное оформление спектакля /В.Н.Мюллер. – М.: Искусство,1956. – 101 с.

17. Немиро, О.В. В город пришёл праздник. Из истории художественного оформления советских массовых празднецтв / О.В.Немиро – Л.: Искусство, 1973. – 121 с.

18. Силин, А.Д. Площади – наши палитры /А.Д.Силин. – М.: Искусство, 1982. – 134 с.

19. Страчаная спадчына / Т.В. Габрусь, А.М. Кулагін, Ю.У. Чантурыя і інш. Уклад. Габрусь Т.В. – Мн.: Полымя, 1998. – 351 с.

20. Федорук, А.Т. Садово-парковое искусство Белоруссии / А.Т.Федорук. – Мн.: Ураджай, 1989. – 247 с.

21. Хадыка, А.Ю.Непаўторныя рысы: З гісторыі беларускага партрэта / А.Ю.Хадыка, Ю.В.Хадыка. – Мн.: Навука и тэхника, 1992. – 144 с.

22. Художник и город. Сб. статей. – М.: Искусство, 1988. –134 с.

23. Художник и зрелище. Сб. статей. – М.: Искусство, 1990. – 99 с.

24. Цітоў А.К. Менск – места майстроў: Рамесныя цэхі XVI -- XVIII стст. / А.К.Цітоў. – Мн.: Беларусь, 2002. –110 с.

25. Чантурия, В.А. Памятники архитектуры и градостроительства Белоруссии / В.А.Чантурия. – Мн.: Полымя, 1986. – 240 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ